*Конфиденциальность* имеет значение: Инструментам ИИ нужны данные для работы и эти данные часто поступают от самих учащихся. Важно обеспечить соблюдение конфиденциальности и безопасности данных обучающихся при использовании этих инструментов.

*Открытость и подотчетность*: учителям важно открыто говорить о том, как они используют ИИ в классе, а учащиеся должны понимать, как эти инструменты помогают им в процессе обучения.

*Участие обучающихся*: когда дело доходит до использования ИИ в классе, учащиеся должны иметь право голоса. Необходимо учитывать их мнение о том, как используются эти инструменты и как их можно улучшить, чтобы качественнее поддерживать их обучение.

Таким образом, благодаря текущим достижениям в области искусственного интеллекта, теперь можно быстро и масштабно персонализировать учебный процесс для обучающихся на основе их индивидуальных потребностей, форматов и стилей обучения. Кроме того, ИИ может помочь оптимизировать административные задачи, такие как планирование уроков и коммуникация, позволяя учителям сосредоточиться на том, что важно: обучении и решении образовательных задач.

Искусственный интеллект – инструмент для нового поколения учителей: вдохновляющих наставников, методистов, медиаперсон и создателей уникальных образовательных программ.

**Литература**

1. Ai for education: сайт. ИИ для образования. URL: https://www.aiforeducation.io / (дата обращения: 16.01.2025). – Режим доступа: для зарегистрир. пользователей.

2. Прокуратова В. / ИИ для преподавателей / URL: https://vprok.yonote.ru/share/087fc0f4-65f8-4e82-9cdc-0c876acdb942 / (дата обращения: 20.01.2025).

***УДК 378.147:821.161.3***

***А. В. Брадзіхіна***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

## РОЛЯ КАМЕНТАРА НА ЎРОКУ ЛІТАРАТУРЫ

Каментар, або слова настаўніка, – адзін з самых распаўсюджаных славесных метадаў на ўроку літаратуры. Звычайна ён выкарыстоўваецца некалькі разоў на працягу адных заняткаў і ўяўляе сабой вуснае выступленне настаўніка з мэтай данясення пэўнай інфармацыі па тэме ўрока. Традыцыйныя метадычныя патрабаванні да слова настаўніка – дакладнасць, лаканічнасць, правільнасць, выразнасць.

Пры гэтым варта ўсведамляць істотную розніцу паміж такімі блізкімі, на першы погляд нават падобнымі, славеснымі метадамі, як лекцыя, і каментар. І справа не толькі ў працягласці: першая звычайна доўжыцца 15–20 хвілін на ўроку, другі займае не больш за пяць хвілін. Акрэслім асноўныя адрозненні паміж імі. Калі лекцыя раскрывае праблему канцэптуальна, то слова настаўніка канцэнтруецца на прыватным, другарадным аспекце тэмы ўрока. Скажам, пры вывучэнні тэмы “Францыск Скарына” (10 клас) прадметам лекцыі стане жыццё і дзейнасць вялікага асветніка, але на працягу ўрока настаўніку давядзецца некалькі разоў звярнуцца да такога метаду, як каментар, тлумачачы, да прыкладу, прадугледжаныя школьнай праграмай тэарэтычныя паняцці “прадмова” і “пасляслоўе” або знаёмячы школьнікаў з вобразам Ф. Скарыны ў мастацтве (“З. Азгур. «Францыск Скарына»; А. Глебаў. Помнік Ф. Скарыну ў Полацку; <…>. Жывапіс: І. Ахрэмчык. “Францыск Скарына”; Г. Вашчанка. “Роднае слова. Францыск Скарына”; Л. Шчамялёў. “Францыск Скарына. Вяртанне”. Музыка: Д. Смольскі. Опера «Францыск Скарына». Кінамастацтва: “Я, Францыск Скарына…” (рэжысёр Б. Сцяпанаў” [1])).

Наступнае адрозненне лекцыі ад каментара палягае ў абавязковым спалучэнні яе з іншымі метадамі, па-першае, нагляднымі – ілюстрацыяй і дэманстрацыяй, бо лекцыя патрабуе візуальнай апоры, неабходнай дзецям па прычыне недастатковай сфарміраванасці абстрактнага мыслення. Па-другое, каб пад час лекцыі арганізаваць актыўнае прaслухоўванне, настаўнік павінен заняць вучняў практычнай дзейнасцю: запісам тэзісаў (абавязкова дублююцца на слайдзе), складаннем плана, стварэннем апорных канспектаў (невялікіх тэкстаў з лакунамі, у якія школьнікам неабходна ўставіць прапушчаныя словы), запаўненнем храналагічных ці канцэптуальных табліц і інш. У дачыненні да слова настаўніка гэтае патрабаванне факультатыўнае, яно захоўваецца толькі ў адносінах да пэўных відаў каментара, да прыкладу, гістарычнага. У большасці выпадкаў слова настаўніка дзеці проста слухаюць.

Метад каментара мае шэраг уласных прыёмаў. Асноўныя з іх наступныя: уступнае і заключнае слова, гістарычны (гісторыка-бытавы, гісторыка-культурны, сацыяльна-бытавы каментар), біяграфічная і тэарэтычная даведка, каментар эпіграфа, табліцы, партрэта пісьменніка, кніжнай выставы, лексічная даведка. Уступнае слова, як правіла, ужываецца непасрэдна перад вывучэннем тэмы, адкрывае яе. Яго асноўная задача – стварыць псіхалагічны настрой, пэўны эмацыйны фон, адпаведны твору, які вывучаецца на ўроку. Менавіта таму ад настаўніка патрабуецца пэўная экспрэсія, узмацненне неабходнага пафасу пры рэалізацыі гэтага віду каментара. Падобныя задачы можа мець і заключнае слова, хаця яно не абмяжоўваецца адзінай функцыяй. Калі паспяховасць класа ніжэй за сярэднюю і вучні не здольны самастойна сфармуляваць высновы па тэме, настаўнік мусіць данесці іх менавіта ў выглядзе заключнага слова.

Біяграфічная даведка выкарыстоўваецца пераважна ў 5–8 класах, паколькі з 9 класа творчасць пісьменнікаў вывучаецца манаграфічна, з абавязковым зваротам да асноўных этапаў іх жыцця і творчасці. Варта адзначыць, што выкарыстанне біяграфічнай даведкі павінна быць падпарадкавана канкрэтнай мэце, а не ўжывацца адвольна. Скажам, пры вывучэнні верша “Бывай” А. Куляшова васьмікласнікаў абавязкова трэба пазнаёміць з жыццёвай (ці калялітаратурнай легендарнай?) асновай тэксту, згодна з якой першы варыянт верша быў напісаны чатырнаццацігадовым падлеткам – іх равеснікам – пад уплывам яго кахання да Сашы Карыткінай. Аднак пры вывучэнні баек К. Крапівы ў тым жа класе біяграфічная даведка немэтазгодная, яна можа выкарыстоўвацца хіба толькі ў выглядзе пэўных незвычайных фактаў з жыцця пісьменніка з мэтай павышэння цікавасці школьнікаў да яго асобы.

Гістарычны каментар і яго разнавіднасці – гісторыка-бытавы, гісторыка-культурны, сацыяльна-бытавы – ужываюцца даволі часта, бо ў школьнай праграме не так і шмат твораў, прысвечаных сучаснай тэматыцы. Дзеці часта даволі цьмяна ўсведамляюць мінулыя эпохі і ўмовы, у якіх адбываюцца дзеянні ў творы. Скажам, пры вывучэнні твора “На Каляды к сыну” З. Бядулі сямікласнікам складана зразумець матывацыю беднай сялянкі, з уласнай волі і жадання аддаўшай маленькага сына, які быў сэнсам яе жыцця, багатым людзям на выхаванне. Настаўнік павінен растлумачыць трагедыйнае становішча няшчаснай маці, апелюючы ў даступнай дзецям форме да грамадска-палітычных працэсаў XIX – пачатку XX стагоддзя. Варта падкрэсліць, што гэта ці не адзіны від каментара, які патрабуе абавязковага спалучэння з нагляднымі метадамі. Так, наўрад ці вучні атрымаюць паўнавартаснае ўяўленне пра шляхту, калі настаўнік візуальна не прадэманструе адметнасці побыту і звычаяў гэтага саслоўя пры выкарыстанні гісторыка-бытавога каментара перад вывучэннем “Пінскай шляхты” В. Дуніна-Марцінкевіча ў 9 класе.

Агульнадыдактычны прынцып навуковасці патрабуе ад вучняў у часе аналізу твора аперыраваць тэарэтычнымі паняццямі. Адпаведна праграма прадугледжвае ўвядзенне літаратуразнаўчай тэрміналогіі ў кожным класе. Адным са спосабаў растлумачыць навуковыя паняцці якраз і з’яўляецца тэарэтычная даведка, якая можа спалучацца з запісам тэзісаў ці графічнымі формамі работы (складаннем табліц, кластараў, схем і інш.). Варта помніць, што калі гаворка ідзе пра мастацкія сродкі, то абавязковым з’яўляецца не проста іх выяўленне ў тэксце твора, але і вызначэнне функцый.

Эпіграф выкарыстоўваецца на ўроку пераважна ў тым выпадку, калі настаўнік абірае праблемна-тэматычны шлях аналізу, прыдатны найперш для разгляду твораў сярэдняй і буйной эпічнай формы, драматургіі, дзе ўздымаецца шмат праблем, або для філасофскай ці грамадзянскай лірыкі, скажам, для вершаў "Шчасце" М. Танка або "Спадчына" Я. Купалы. Эпіграф – гэта разнавіднасць праблемнай сітуацыі, аформленай у выглядзе цытаты вядомай асобы, а таму патрабуе двайнога звароту на працягу вывучэння тэмы. У пачатку ўрока (або вывучэння новага матэрыялу) дэманструецца неадназначная цытата, якую школьнікі спрабуюць адвольна інтэрпрэтаваць, абапіраючыся на ўласны жыццёвы досвед. На гэтым этапе працы важна прымаць усе вучнёўскія меркаванні і інтэрпрэтацыі, не адхіляць нават не зусім лагічныя. На заключным этапе вывучэння мастацкага твора цытата дэманструецца зноў з мэтай накласці яе на асноўную праблему твора. Калі ўсё зроблена правільна, то першы каментар набудзе вялікую колькасць варыяцый адказаў, а другі раз вучні выбудуюць нейкае агульнае рашэнне пастаўленай у творы праблемы і сфармулююць яго ідэю.

Лексічную даведку нярэдка называюць слоўнікавай работай, хаця такая замена бачыцца нам некарэктнай па прычыне неадпаведнасці аб'ёму згаданых паняццяў. Другое нашмат шырэйшае за першае, бо можа ўключаць любую працу са словам, у тым ліку разбор тропаў у працэсе стылёвага шляху аналізу. Лексічная даведка прадугледжвае вытлумачэнне незнаёмых ці незразумелых слоў, якія сустракаюцца ў мастацкім творы. Існуе больш за дзесяць спосабаў тлумачэння такіх слоў (сінонімы, антонімы, дэфініцыя, этымалогія, дэманстрацыя і інш.), сярод якіх да перакладу на рускую мову ва ўмовах культурнай сітуацыі білінгвізму трэба звяртацца толькі ў крайніх выпадках, калі іншыя спосабы вычарпаны. Варта падкрэсліць неабходнасць падачы незразумелых слоў у кантэксце як мінімум словазлучэння, што спрыяе лепшаму іх запамінанню дзецьмі, а таксама стварэння ўмоў для выкарыстання вучнямі новых слоў у вусным маўленні. Лексемы, звязаныя з флорай і фаўнай, гістарызмы і архаізмы патрабуюць у дадатак прымянення метадаў ілюстрацыі ці дэманстрацыі.

Яшчэ адзін прыём, звязаны са словам настаўніка, – каменціраванае чытанне – прадугледжвае папярэднюю разбіўку твора педагогам-славеснікам на адносна скончаныя ўрыўкі і разбор кожнага з іх пасля чытання вучнямі ў класе. Каменціраванае чытанне не рэкамендавана выкарыстоўваць у якасці першаснага, за выключэннем твораў, натуральнае ўспрыманне якіх выклікае цяжкасці (да прыкладу, творы старажытнай літаратуры ці п'есы). У залежнасці ад этапа вывучэння твора падбіраецца змест каментароў. Калі яно арганізуецца на арыентацыйным этапе, то тут важна растлумачыць незразумелыя словы, падаць звязаную з часам напісання або часам дзеяння ў творы гістарычную даведку, калі гэтага патрабуе тэкст, і выкарыстаць гутарку рэпрадуктыўнага характару, звярнуўшы ўвагу вучняў на тыя факты ці мастацкія дэталі, якія пазней спатрэбяцца пры разборы ідэйнага зместу твора. Калі каменціраванае чытанне рэалізуецца пад час паслядоўнага шляху аналізу, то рэпрадуктыўныя пытанні замяняюцца эўрыстычнымі, а неабходнасць у лексічнай даведцы адпадае.

Такім чынам, роля каментара на ўроку літаратуры надзвычай вялікая. Ён выкарыстоўваецца на ўсіх этапах вывучэння мастацкага твора – уступным, арыенціровачным, аналізе і заключным – і мае вялікую колькасць разнавіднасцей: уступнае і заключнае слова, гістарычны (гісторыка-бытавы, гісторыка-культурны, сацыяльна-бытавы каментар), біяграфічная і тэарэтычная даведка, каментар эпіграфа, табліцы, партрэта пісьменніка, кніжнай выставы, лексічная даведка. Методыка патрабуе як мінімум двухразовага прачытання тэксту вучнямі, каменціраванае чытанне дазваляе арганізаваць яго даволі эфектыўна.

### Літаратура

1. Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце "Беларуская літаратура" для X класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу:

https://adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess-2023-2024-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie/uchebnye-predmety-v-xi-klassy/belaruskaya-litaratura.html. – Дата доступу: 25.01.2025.

***УДК 37.091.322:34-057.874***
***В. А. Брилёва,***
*г. Гомель, ГГУ имени Ф. Скорины*

## ОБ ОРГАНИЗАЦИИ ЮРИДИЧЕСКОЙ ОЛИМПИАДЫ ШКОЛЬНИКОВ

В 2024 году на базе юридического факультета Гомельского государственного университета имени Франциска Скорины стартовала Областная юридическая олимпиада школьников, организованная кафедрой гражданско-правовых дисциплин. Областная юридическая олимпиада направлена на формирование и укрепление традиции юридических соревнований среди учащихся 10-х и 11-х классов учреждений общего среднего образования г. Гомеля и Гомельской области. В рамках Областной юридической олимпиады осуществляется профессиональная ориентация учащихся 10-х и 11-х классов учреждений общего среднего образования г. Гомеля и Гомельской области, реализация инновационных методик обучения, укрепление взаимодействия учреждений общего среднего образования и Гомельского государственного университета имени Франциска Скорины, популяризация юридической профессии, знакомство с материально-технической базой высшей школы.

С целью организации Областной юридической олимпиады, которая с 2025 года получает название «Скорининская юридическая олимпиада школьников» (далее по тексту – Скорининская олимпиада), разработано положение, определяющее порядок организации и проведения Скорининской олимпиады, её организационно-методическое обеспечение, порядок участия школьников и определения победителей.

Скорининская олимпиада проводилась в феврале-марте 2024 г. в заочной формате. Участниками Скорининской олимпиады стали учащиеся 10-х и 11-х классов учреждений общего среднего образования г. Гомеля и Гомельской области. Участие в Скорининской олимпиаде осуществляется бесплатно на добровольных началах на основе заявки и при условии выполнения заданий.

Для организационно-методического обеспечения проведения Скорининской олимпиады формируются Организационный комитет и Жюри, членами которых являются руководство юридического факультета, профессорско преподавательский состав кафедры гражданско-правовых дисциплин. В текущем году запланировано проведение Скорининской олимпиады с 10 февраля по 26 марта при содействии Управления Следственного комитета Республики Беларусь по Гомельской области, представители которого войдут в состав Организационного комитета и станут членами Жюри.

В 2024 году в Скорининской олимпиаде принимали участие 58 школьников из 21 населенного пункта Гомельской области и г. Гомеля, в том числе из Мозыря, Калинковичей, Жлобина, Кормы, Житковичей, Чечерска, Ельска, Рогачёва, Светлогорска, Хойников и других городов, поселков городского типа и деревень.

Победители Скорининской олимпиады были награждены дипломами I, II, III степени и ценными подарками: дипломы I степени получили 6 школьников (Черкас А. А., Сацура Ю. Н., Тимоховцева В. В., Казак М. В., Целуйко К. М., Хулуп К. Д.); дипломы II степени – 9 школьников (Ковбеня А. В., Скачеляс В. О., Шлег А. А., Лысякова Д. Г., Волкова М. М., Байлукова М. Е., Медведкова Э. А., Демиденко И. А., Хаврученко С. А.); дипломы III степени – 17 школьников (Глазкова К. К., Индрилюнас М. В., Яцухно Д. Л., Лабузов К. В., Атрощенко М. А., Титова К. В., Склименок А. С., Осипенко Р. А., Зайцева М. А., Баранкевич К. Э. и другие). Участникам олимпиады были вручены благодарности от Гомельского государственного университета имени Франциска Скорины.